# АЛІЧБОЎКА БІБЛІЯТЭЧНЫХ ФОНДАЎ ЯК ВЫТВОРЧЫ ПРАЦЭС

***Бураўкін Аляксей Генадзьевіч****, загадчык аддзела электроннай апрацоўкі фондаў НББ*
***Шыдлоўская Ганна Анатольеўна****, вядучы інжынер аддзела электроннай апрацоўкі фондаў НББ*

Алічбоўка – гэта працэс стварэння лічбавай мадэлі аб’екта, прыдатнай для камп’ютэрнага захавання і апрацоўкі. Алічбоўка ўвасабляе “віртуальную копію” аб’екта, якой уласцівы магчымасці:

- адлюстравання мультымедыйнага вобразу арыгінала;
- надзейнага доўгатэрміновага кампактнага захавання;
- хуткай перадачы (распаўсюджання).

Таму алічбоўка разглядаецца як эфектыўны сродак аднаўлення інфармацыйных рэсурсаў. У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі гэта з’яўляецца неад’емнай часткай вытворчых інфармацыйных працэсаў. Лічбаванню падлягаюць:

- друкаваныя выданні:
- старадрукі;
- рэдкія выданні;
- рукапісы;
- кнігі;
- нотныя выданні;
- іншыя;
- вінілавыя дыскі;
- каталожныя карткі;
- іншыя матэрыялы (фотаздымкі, малюнкі, унутраная дакументацыя і г. д.)

Па кожнаму з відаў алічбаваных аб’ектаў устанаўліваецца ўзгоднены (з адпаведнымі падраздзяленнямі – трымальнікамі арыгінальных рэсурсаў) рэгламент іх атрымання, выкарыстання і зваротнай перадачы. У працэсе першаснага асваення (алічбоўкі) новага віду рэсурсаў вызначаюцца сярэднія паказчыкі і нарматывы:

- азначэнне і агульныя характарыстыкі адзінкі алічбоўкі;
- крытэрыі якасці алічбоўкі;
- тэхнічныя паказчыкі ўплыву на якасць мультымедыйнай копіі;
- вызначэнне фармату выніковага файла;
- сярэдні час апрацоўкі адзінкі;
- разлікі колькасных нарматываў на планаваныя тэрміны.

На падставе апошніх характарыстык распрацоўваецца методыка, якая кладзецца ў аснову арганізацыі адпаведных работ.

| Трымальнік рэсурсаў | Адзінка алічбоўкі | Нарматывы (адз./дзень) | Фармат выніковага файла |
|---|---|---|---|
| Аддзел бібліяграфічнай апрацоўкі дакументаў (ГСАК) | Каталожнвая картка | 8560 | TIFF |
| Аддзел мастацтва | Вінілавы дыск | 8 | WAV |
| Аддзел кнігазахоўвання | Аўтарэферат дысертацыі | 15 | PDF |
| НДА кнігазнаўства | Старонка дакумента | – | JPG |
| НДА кнігазнаўства | Дакумент | – | PDF |
| Аддзел бібліяграфічнай апрацоўкі дакументаў | Дакумент | – | PDF |
| Аддзел рэкламы і сувязей з грамадскасцю | Артыкул (перыядычнага выдання) | – | PDF |
| Іншыя аддзелы | Разнастайная дакументацыя | – | JPG, PDF, DOC |

Адсутнасць нарматыўных паказчыкаў для некаторых тыпаў дакументаў тлумачыцца:

- разнастайнасцю відаў сканераў, кожны з якіх мае ўласныя тэхнічныя характарыстыкі;
- неаднароднасцю структуры дакумента (фармат, аб'ём);
- разнастайнасцю патрабаванняў да якасці.

Колькасныя характарыстыкі працэсу алічбоўкі залежаць: у большай ступені – ад апаратнага забеспячэння (прадукцыйнасці абсталявання для алічбоўкі), у меншай – ад праграмнага (эфектыўнасць алгарытмаў першаснай апрацоўкі). Пры абнаўленні апаратнага (або праграмнага) забеспячэння ажыццяўляюцца выпрабаванні (вопытная эксплуатацыя), вынікам якіх з'яўляецца новая версія табліцы нарматыўных паказчыкаў.

Ніжэй прыведзена табліца асноўных вытворчых паказчыкаў аддзела ЭАФ за 2006 г.

| Задача | Падзадача | Адзінка вымярэння | Фактычныя паказчыкі |
|---|---|---|---|
| Алічбоўка і першасная электронная апрацоўка вінілавых дыскаў (грампласцінак) | Алічбоўка | Вінілавы дыск | – |
| | Апрацоўка і запіс на CD | Вінілавы дыск | – |
| | Апрацоўка: платныя паслугі (сумесна з аддзелам мастацтва) | Вінілавы дыск | – |
| | | Аўдыё-CD | – |
| | Запіс на CD: платныя паслугі (сумесна з аддзелам мастацтва) | Хвіліна | 466 |
| Алічбоўка і першасная электронная апрацоўка аўтарэфератаў дысертацый (беларусіка) | Сканіраванне | Аўтарэферат | 75 |
| | Апрацоўка | Аўтарэферат | – |
| Сканіраванне дакументаў для аддзелаў НББ | Сканіраванне арганізацыйна-распарадчай дакументацыі (НДА бібліятэказнаўства) | Старонка | 503 |
| | Сканіраванне для патрэб аддзелаў | Старонка | 526 |
| | | Умоўная старонка (уключна з газетнымі) | 743 |
| | Сканіраванне артыкулаў супрацоўнікаў НББ для размяшчэння на сайце | Старонка | 297 |

| | | | |
|---|---|---|---|
| Сканіраванне і першасная электронная апрацоўка друкаваных і графічных матэрыялаў у межах асобных праектаў | “Гісторыя НББ” | Умоўная старонка | 158 |
| Рэтраспектыўная канверсія карткавых каталогаў (сканіраванне, электронная апрацоўка і вядзенне сховішча) | Сканіраванне і запіс рэзервовых копій | Картка (графічны файл) | 3 791 367 |